http://edoc.bseu.by

12. Skrzetuski, K.J. Historya Polityczna Dla Szlachetney Młodzi / K.J. Skrzetuski. – Warszawa : Druk. Pijarów, 1777. – IV, 429 s.

*І.І. Сацукевіч, магістр гісторыі,*
*БДЭУ, г. Мінск*
ivansat@rambler.ru

# ПАМЯЦЬ ПРА ПОДЗВІГ НАРОДА Ў ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ Ў НАЗВАХ ВУЛІЦ МІНСКА

Працэс мемарыялізацыі партызан і падпольшчыкаў у назвах вуліц Мінска шмат у чым адлюстроўваў адносіны камуністычнай партыі да падпольнага і партызанскага руху. Старт кампаніі па найменаванні вуліц у гонар удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны у Мінску быў дадзены ў пачатку 1947 г., калі новыя вуліцы мікраёна прыватнай забудовы каля вул. Валгаградскай атрымалі імёны Гастэлы, Даватара, Панфілава, Чарняхоўскага, Ватуціна, Матросава [10, арк. 51]. Знайшлося сярод іх і месца для партызанаў. Так, адна з вуліц была названа ў гонар З. Касмадземьянскай , а другая – К. Заслонава.

У наступным 1948 г. новая вуліца каля Аўтазавода стала праспектам Чырвоных партызан [11, арк. 39]. Чаму для гэтага была выбрана менавіта такая назва і месца, становіцца ясна, калі адкрыць карту Мінска. Пачынаецца праспект Чырвоных партызан (сёння – вул. Цэнтральная) ад Магілёўскай шашы, па якой у Мінск 16 ліпеня 1944 г. ўвайшлі для ўдзелу ў парадзе беларускія партызаны. У Мінску ўжо існавала вул. Партызанская, названая яшчэ ў 1920-я гг. у гонар Козыраўскіх партызан, якія выступалі супраць немецкіх акупантаў у 1918 г. Таму ў 1948 г. з’явіўся менавіта праспект Чырвоных партызан.

У 1949 г. адна з вуліц Трактаразаводскага пасёлка была названа ў гонар члена падпольнай групы “Маладая гвардыя” А. Кашавога, вядомасць пра якога шырылася ў тыя гады на ўвесь СССР. У наступным годзе найменаваннем вуліцы ў Мінску была ўшанавана памяць аднаго з першых партызан Герояў Савецкага Саюза, Ц. Бумажкова [12, арк. 162]. Далей амаль 10 год ніякіх новых найменаванняў у гонар удзельнікаў партызанскага і падпольнага руху не было. Калі не лічыць адну маленькую вулачку на ўскраіне Мінска, названую ў гонар легендарнага дзеда Талаша ў 1957 г.

Часы хрушчоўскай “адлігі” прынеслі змены і ў гарадскую тапаніміку. Так, у 1959 г. пачалася мемарыялізацыя ўдзельнікаў Мінскага антыфашысцкага падполля, калі рашэннем Бюро ЦК КПБ было афіцыйна прызнана існаванне і дзейнасць разгалінаванага падполля ў Мінску [1, с.168]. Ужо ў наступным 1960 г. гэта знайшло адлюстраванне на вулічных шыльдах Мінска: рашэннем Мінскага гарадскога савета вул. Іпадромная была перайменавана ў гонар аднаго з актыўных дзеячаў Мінскага падполля, Героя Савецкага Саюза М. Кедышкі [9, арк.515]. На доме, дзе знаходзіўся штаб падпольнай арганізацыі “Андруша”, стваральнікам якой з’яўляўся М. Кедышка (вул. Магілёўская, 68), была ўсталявана мемарыяльная дошка. Цікава, але рашэнне аб ушанаванні памяці Кедышкі было прынята разам з перайменаваннем вул. Зялёнае кола ў гонар В. Харужай – аднаго з арганізатараў партыйнага падполля ў Віцебску. У гэтым можна ўбачыць асцярожнасць, з якой падыходзілі партыйныя ўлады да прызнання Мінскага падполля. Разам з тым зноў пачалі называць вуліцы ў гонар партызан: у 1961 г. невялікая вулачка ў былой вёсцы Вілкаўшчына атрымала імя Марата Казея.

Прызнанне Мінскага падполля адбылося, і заставалася толькі чакаць зручнага моманту для ўключэння “падпольнага” пытання ў тэматыку Вялікай Айчыннай вайны. І такі момант наступіў у 1964 г., калі адбылося шырокае святкаванне 20-годдзя вызвалення

Беларусі. Мінгарсавет 11 чэрвеня 1964 г. прыняў Рашэнне № 172, згодна з якім “у мэтах увекавечання памяці актыўных удзельнікаў партыйнага падполля г.Мінска, загінуўшых у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны”, 9 вуліц горада былі перайменаваныя ў гонар мінскіх падпольшчыкаў [7, арк.194]. Так, імя рэдактара падпольнай “Звязды” У. Амельянюка было нададзена новай вуліцы ў Заводскім раёне горада, у гонар З. Гало перайменавалі Цнянскі завулак, І. Кабушкіна – вул. Маладзёжны пасёлак, І. Казінца – Паўднёвую, Я. Клумава – Клубную, Дз. Караткевіча – вул. Аэрапорт, Г. Сямёнава – Германаўскую, К. Хмялеўскага – Пакгаўзную, а 9-му Чыгуначнаму завулку надалі імя В. Шацько. На ўсіх прапанаваных да ўвекавечання ў назвах мінскіх вуліц дадаваліся падрабязныя біяграфічныя даведкі, падпісаныя намеснікам дырэктара Інстытута гісторыі партыі пры ЦК КПБ па партархіву С. Пачаніным [7 , арк.195]. Заўважым, што амаль усе гэтыя вуліцы з’яўляліся другараднымі, нібыта для тых, хто прымаў рашэнне аб перайменаванні, быў больш важны менавіта факт перайменавання, а тое, што назвы вуліц вельмі рэдка будуць трапляць у эпіцэнтр гарадскога жыцця, зусім іх не хвалявала.

Другая палова 1960-х – 1970-я гг. не сталі “застойнымі” у справе мемарыялізацыі памяці беларускіх партызан і падпольшчыкаў: шмат называлі новых і пераймяноўвывалі старыя, пры чым вуліцы вялікія і важныя. Можна меркаваць, што гэта было звязана з заняццем пасады кіраўніка ЦК КПБ П. Машэравым. Так, у 1967 г. 2 вуліцы былі перайменаваны ў гонар арганізатараў партызанскага руху. Даўгабродская стала насіць імя В. Казлова, а Каменная – В. Варанянскага. У наступным 1968 г. другая па важнасці траса Мінска – Магілёўская шаша – была перайменавана ў Партызанскі праспект [13, арк.66].

Наступнае ўшанаванне памяці пра Мінскае падполле адбылося ў 1969 г. на 25-гадовы юбілей вызвалення Беларусі. У гэтым годзе адна з новых вуліц мікраараёна “Ракаўская шаша” была названа ў гонар члена Мінскага падпольнага гаркама КП(б)Б В. Жудро [2, с.218-219]. У 1971 г. яшчэ дзве новыя і, заўважым, важныя для горада вуліцы былі названы ў гонар кіраўнікоў Мінскага падполля. Так, адна з іх атрымала імя сакратара Кастрычніцкага падпольнага райкама КП(б)Б Мінска М. Каржанеўскага, а другая – сакратара Чыгуначнага райкама І. Матусевіча [8, арк.35].

На чарговы юбілей, у 1974 г., адбываецца перайменаванне невялікай вул. Вузаўскай, дзе размяшчаліся інтэрнаты педынстытута імя М. Горкага, у гонар кіраўніка падпольнай камсамольска-маладзёжнай групы Кастрычніцкага раёна Мінска А. Ляўкова [6, арк. 234]. А новыя вуліцы атрымалі імёны вядомых удзельнікаў партызанскага руху І. Бельскага і В. Каржа. Неаднаразова ўшаноўвалася памяць пра мінскіх падпольшчыкаў у 1977 г. Так, 24 лютага прымаецца рашэнне Мінгарсавета аб наданні новай вуліцы імя арганізатара падпольнай групы “Дзядзі Васі” М. Дразда, загінуўшага разам з сям’ёй ў Трасцянецкім лагеры [3, с.163-164]. У сувязі з 60-годдзем “Вялікага Кастрычніка” 4 лістапада 1977 г. яшчэ дзве новыя вуліцы атрымалі імёны мінскіх падпольшчыкаў. У мікраараёне “Захад” знайшлося месца аднаму з арганізатараў Мінскага падполля Л. Адзінцову, а ў мікраараёне “Ангарская” – сакратару Сталінскага падпольнага камітэта Н. Герасіменку.

У 1980 г. пасля трагічнай смерці П. Машэрава ў ягоны гонар была перайменавана Паркавая магістраль (сучасны праспект Пераможцаў). У 1985 г. (40 год Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне) Рашэннем Мінгарсавета № 184 ад 3 ліпеня ў гонар удзельнікаў падполля былі названы дзве новыя вуліцы ў мікраараёне “Уручча”. Былі ўвекавечана імя члена Мінскага падпольнага гаркама В. Нікіфарава і сакратара Варашылаўскага падпольнага райкома КП(б)Б М. Шугаева. У гэтым жа годзе ў склад Мінска была ўключана вёска Лошыца-1, галоўную вуліцу якой назвалі ў гонар падпольшчыц сясцёр Чыжэўскіх, загінуўшых на ёй. А адна з новых вуліц мікраараёна Захад была названа ў гонар удзельніка партызанскага руху У. Лабанка.

Пасля гэтага ў справе мемарыялізацыі Мінскага падполля ў назвах вуліц назіраецца перапынак на 13 год. Толькі ў 1998 г. гарадскія ўлады вырашылі ўвекавечыць імя аднаго са стваральнікаў Мінскага падполля, сакратара Мінскага падпольнага гаркома КП(б)Б І.

Кавалёва. Доўгія дзесяцігоддзі лічылася, што Кавалёў з'яўляўся здраднікам, ягонае імя не ўзгадвалася ў літаратуры, прысвечанай Мінскаму падполлю, і толькі ў 1990 г. усе абвінавачанні былі зняты і гэтаму чалавеку было вернута добрае імя [4, с.20-21]. У гонар кіраўніка Мінскага падполля была названа вуліца ў былой вёсцы Сухарава (раней – Цэнтральная), далучанай да Мінска ў 1997 г. Там жа з'явілася вуліца партызана Р. Мачульскага.

Апошнім з кіраўнікоў падпольных раённых камітэтаў, хто не быў ушанаваны ў назвах мінскіх вуліц, з'яўляўся М. Гебелеў – сакратар Тэльманаўскага райкома, размешчанага ў гета. Калі прызнанне савецкімі ўладамі Мінскага падполля ў пасляваенны час хоць не адразу, але адбылося, то факт існавання арганізаванай барацьбы ў гета адмаўляўся. І толькі ў 1990-я гг. нам адкрылася жахлівая праўда Мінскага гета. Зусім справядліва выглядае перайменаванне ў 2005 г. Мэблевага завулка (знаходзіцца на тэрыторыі былога гета) у вуліцу імя М. Гебелева [14]. У 2010 г. была ўшанавана памяць партызанскага камадзіра В. Лівенцава, калі ягоным імём была названа новая вуліца.

Можна зрабіць выснову, што мемарыялізацыя імёнаў партызан і падпольшчыкаў у назвах гарадскіх вуліц з'яўлялася ў 1960-1985 гг. адлюстраваннем палітыкі партыйных органаў улады. Калі ў першай палове 1960-х гэтая палітыка была асцярожнай і шмат у чым фармальнай, то пасля – больш рашучай. Амаль усе найменаванні ў савецкі час у гонар падпольшчыкаў і партызан былі прывязаны да юбілейных дат, але былі бессістэмнымі. У апошнія гады былі зроблены спробы выправіць некаторыя хібы ў пытанні ўвекавечання памяці ўдзельнікаў партызанскага і падпольнага руху.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**


1. Бараноўскі Я., Ігнаценка І. Мінскае патрыятычнае падполле // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Том 5. – Мінск, 1999. С.165-169.
2. Их именами названы. Энциклопедический справочник. Мн., 1987.
3. Минск. Энциклопедический справочник. – Минск, 1983.
4. Мінскае антыфашысцкае падполле. – Минск, 1995.
5. Дзяржаўны архіў Мінскай вобласці (ДАМВ). – Ф. 6. Воп. 4. Спр. 149. Арк. 25–29.
6. ДАМВ. – Ф. 6. Воп. 3. Спр. 1106.
7. ДАМВ. – Ф. 6. Воп. 3. Спр. 325.
8. ДАМВ. – Ф. 6. Воп. 3. Спр. 897.
9. ДАМВ. – Ф. 6. Воп. 3. Спр. 93.
10. ДАМВ. – Ф. 6. Воп. 4. Спр. 91. Арк. 51.
11. ДАМВ. – Ф. 6. Воп. 4. Спр. 186. Арк. 39.
12. ДАМВ. – Ф. 6. Воп. 4. Спр. 282. Арк. 162
13. ДАМВ. – Ф. 6. Воп. 3. Спр. 590. Арк. 66
14. Рашэнне Мінгарсавета № 176 ад 16 чэрвеня 2005 года.



*И. Н. Сидоренко, доктор философских наук, профессор,*
*БГУ, г. Минск*
Iri_na2000@rambler.ru


# СОЦИАЛЬНАЯ ИСТОРИЧЕСКАЯ ПАМЯТЬ: ОСНОВНЫЕ ПОДХОДЫ И СПЕЦИФИКА

Историческая коллективная память по своей природе является социальной и социальнообразующей. Поэтому историческую память можно отождествлять с социальной памятью, которая присуща определенной социальной общности и функционирует в